**Пашкевіч, Т.** Узор жыцця стварае працавітымі рукамі / Т. Пашкевіч // Витебские вести. – 2023. – 7 марта. – С. 10.

## УЗОР ЖЫЦЦЯ СТВАРАЕ ПРАЦАВІТЫМІ РУКАМІ



**Змена набліжаяася да завяршэння. Апаратчык стэрылізацыі кансерваў вытворчага філіяла «Браслаўрыба» ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» Вера Маслякова заканчвае выгтворчы працэс і апошняй пакідае памяшканне. Яна – работнік адказны, адданы прадпрыемству. Прайшла ўсе этапы яго рэарганізацыі асвойваючы тонкасці тэхналагічнага працэсу. Таму нядзіўна, што аказалася ў ліку лаўрэатаў прэміі «Чалавек года Віцебшчыны – 2022».**

Вытворчы філіял «Браслаўрыба» з'явіўся на свет не ў адзін дзень. У цяжкую перабудовачную пару многія калектывы хапаліся за саломінку, каб выжыць. Адны не змаглі ўтрымацца на бурлівых хвалях станаўлення рынкавых адносін і патаналі, іншыя ж адпраўляліся ў свабоднае плаванне, набіралі эканамічную моц. У гэтым кругавароце не стала рыбгаса з яго цэхамі па выпуску кансерваў і вэнджанні рыбы, а яго нішу заняў былы гароднінасушыльны завод. На яго вытворчай базе з'явілася беларуска - літоўскае прадпрыемства, далей – харчовы камбінат, а пасля і «Браслаўрыба» якфіліял Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната. Менавіта ў гэту пару і прыйшла на прадпрыемства Вера Маслякова. Выпускніца мясцовай школы мела спецыяльнасць швачкі, але, як сказала падчас размовы, працаваць ёй не збіралася. Побач быў харчовы камбінат, куды і ўладкавалася. Было гэта ў 1999 годзе. Дзяўчы не толькі споўнілася 19 гадоў.

Тое, што вытрымала, не пайшла шукаць больш лёгкай і «чыстай» пасады, гаворыць пра моцны характар жанчыны. І сёння работа на канвееры па раздзелцы рыбы нялёгкая. Нават пасля мадэрнізацыі прадпрыемства чысціць рыбу восем гадзін у памяшканні, дзе павышаная вільготнасць і гуляюць скразнякі. Скажам шчыра, нялёгка. А 23 гады таму тут наогул было ўсё ўладкавана даволі прымітыўна. Вытрымала, уцягнулася, на яе пачалі раўняцца іншыя

работніцы, і праз колькі гадоў у якасці заахвочвання яе перавялі афармляльнікам гатовай прадукцыі.

Не малюйце ў галаве дызайнерскіх фантазій. Афармляльнік – гэта чалавек, які ўручную наклейваў этыкеткі на гатовыя бляшанкі кансерваў. Норма – 5 тысяч за змену.

– «Афармлялі» і па 6–7 тысяч, узгадвала Вера Канстанцінаўна. – Пакавалі ў каробкі, вага адной была 16 кілаграмаў. Састаўлялі іх у стосы. Так што за змену жанчыны пераносілі неадну тону грузу. Цяпер этыкеткі клеюць машыны, затарваюць і пераносяць каробкі мужчыны і не вераць, што гэта рабілі мы, прадстаўніцы слабага полу.

Так, з адной да другой аперацыі асвойвала вытворчасць Вера Маслякова. Дарасла да аўтаклаўшчыцы. Як і цяпер, гэта была апошняя стадыя вырабу кансерваў. Неверагодна адказная. Апаратару трэба было ўручную венцелямі ствараць у аўтаклаве патрэбныя тэмпературу, ціск, не памыліцца з часам апрацоўкі бляшанак. Не датрымаеш – застануцца цвёрдымі косткі, перетрымаеш – замест цэльных кавалачкаў у бляшанцы акажацца распараная каша.

– Вера Канстанцінаўна вельмі хутка асвоіла працэс, – сказала пра той перыяд начальнік вытворчага ўчастка Алена Барткун. – Не было выпадку, каб падвяла брыгаду.

Некалькі гадоў таму на «Браслаўрыбе» ўстанавілі сучасныя аўтаклавы.

– Працаваць на іх – адно задавальненне. Аўтаматызаваныя, камп'ютарызаваныя, адным словам, «разумныя», яны ўсе разлікі робяць самі, задаюць патрэбныя параметры, сочаць за іх выкананнем, – гаварыла пра сённяшні час Вера Маслякова.

За мінулы год праз рукі апаратчыка стэрылізацыі прайшло каля 40 тон рыбнай прадукцыі, ці 3, 3 тоны кансерваў у месяц. А брыгада ў параўнанні з папярэднім годам больш чым на 150 % павялічыла прадукцыйнасць працы.

– Вера Маслякова ў калектыве пастаянна на слыху, – сказала пра падначаленую Алена Барткун. – Яна арыенцір для ўсіх не толькі як спраўная работніца, прафесіянал сваёй справы, але і як вельмі прыстойны чалавек – спакойны, добразычлівы, паважлівы, таленавіты. Яна захапляецца бісернай вышыўкай, алмазным жывапісам. Састаўляе такія прыгожыя салодкія букеты, якія не спяшаюцца спажыць адораныя імі.

– Гэта маё хобі, рэлакс пасля рабочага дня, – аджартавалася Вера. – Чаму не парадаваць сябе прыемным заняткам, блізкіх – смачнай выпечкай, іншымі прысмакамі. А яшчэ вельмі люблю бываць на прыродзе, любавацца яе прыгажосцю. Сёння ішла на працу і заглядзелася на сосны, якія ўражвалі ўборам – на галінах ляжалі белыя шапкі снегу, а між імі пад промнямі ўзыходзячага сонца пераліваўся і тонкі ўзор ажуру, які сплёў начны мароз з кропелек вады.

У Веры Масляковай узор жыцця таксама прыгожы. Яго яна стварае добрай працай, павагай калег і знаёмых, любоўю да таго, што акружае.

**Тамара Пашкевіч**